Методика опытно-экспериментальной работы предусматривала [2]:

– применение преподавателями учреждения профессионального образования в образовательном процессе активных методов социально-психологического обучения — решение педагогических задач, использование метода проектов, проведение дискуссий, деловых игр, тренингов, анализа педагогических ситуаций;

– обогащение неформальной и информальной образовательной среды учреждения профессионального образования профессионально ориентированными ресурсами — активизацию профессиональных сетей, организацию объединений по интересам, участие обучающихся в проектах, конкурсах;

– создание поддерживающих и сопутствующих образовательных комплексов — подготовка учебно-методических комплектов, разработка электронных учебно-методических комплексов, применение модульных систем, использование информационных сред.

Главным элементом профессиональной подготовки к педагогическому дизайну образовательной деятельности в учреждении дошкольного образования становится опыт решения учащимися разнообразных задач и выполнения социально-профессиональных ролей и функций. Опыт формируется не как традиционные умения, а за счёт активных (рефлексивно-деятельностных) форм и методов обучения, включения обучающихся в созданные в образовательном процессе ситуации, моделирующие профессиональные и жизненно важные проблемы. Такой подход обеспечит формирование у обучающихся учреждений профессионального образования универсальных знаний и опыта, которые не передаются по образцам, а осваиваются посредством самостоятельного поиска способов деятельности в разнообразных учебно-социальных ситуациях. В этой связи учебным планом по специальности 5-04-0112-01 Дошкольное образование учреждения образования «Речицкий государственный педагогический колледж» для учащихся экспериментальной группы в следующем учебном году, на третьем курсе, предусмотрено выполнение программы учебной практики «Пробные занятия с детьми дошкольного возраста» на базе учреждений дошкольного образования города Речицы, которой предусмотрено, что учащиеся овладеют практическими умениями разработки содержания образовательной программы дополнительного образования детей и молодёжи на уровне дошкольного образования и приобретут профессиональные навыки по организации работы объединений по интересам детей дошкольного возраста.

**Заключение.** Для формирования готовности воспитателя дошкольного образования к педагогическому дизайну образовательной деятельности при наличии научно-методического обеспечения его профессиональной подготовки требуется осуществление комплексного анализа педагогических условий проектирования профессиональной деятельности с учётом индивидуальных особенностей организации образовательного процесса в учреждении дошкольного образования, создание организационно-педагогических условий и разработка содержательно-инструментального обеспечения образовательной среды. Опытно-экспериментальная работа направлена на решение задач концептуального характера эмпирическим путём.

**Список цитируемых источников**

1. *Захарченя, Н. Ф.* Педагогический дизайн образовательной деятельности: дошкольное образование : монография / Н. Ф. Захарченя ; М-во образования Респ. Беларусь. — Барановичи : БарГУ, 2024. — 183 с.

2. *Захарченя, Н. Ф.* Университетская образовательная среда как педагогическое условие достижения целей устойчивого развития в системе профессиональной подготовки / Н. Ф. Захарченя // Устойчивое развитие: экономический, правовой и социальный аспекты : коллектив. моногр. / В. В. Климук, Ю. Е. Горбач, Е. В. Климук [и др.] ; М-во образования Респ. Беларусь, Баранович. гос. ун-т. — Минск : ИВЦ Минфина, 2024. — С. 115—124.

УДК 378

**Захарэвіч Іван Іванавіч**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Трабская сярэдняя школа Іўеўскага раёна», Іўе, Рэспублікі Беларусь, zakharevich1964@list.ru*

## ГАТОЎНАСЦЬ ДЗЯЦЕЙ З АГУЛЬНЫМ НЕДАРАЗВІЦЦЁМ МОВЫ ДА НАВУЧАННЯ Ў ШКОЛЕ

У артыкуле ўвага звяртаецца на некаторыя пытанні, якія часта сустракаюцца пры ажыццяўленні падрыхтоўкі дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту да навучання ў школе, ў тым ліку і тых, якія маюць агульнае недаразвіццё мовы. Аўтарам разглядаюцца віды агульнай і спецыяльнай гатоўнасці да школьнага навучання. Ім надаецца ўвага пытанням пераемнасці розных узроўняў адукацыі.

**Ключавыя словы:** гатоўнасць да навучання ў школе; віды гатоўнасці; агульнае недаразвіццё мовы; бесперапыннасць адукацыі для дзяцей з парушэннямі маўлення; пераемнасць.

© Захарэвіч І. І., 2025

Репозиторий БарГУ

**Zakharevich Ivan Ivanovich**
*State Institution of Education "Trabsk secondary school of the Ivyevo district",*
*Ivye, Republic of Belarus, zakharevich1964@list.ru*

## READINESS OF CHILDREN WITH GENERAL LANGUAGE IMPAIRMENT FOR LEARNING IN SCHOOL

The article draws attention to some issues that are often encountered in the preparation of older preschool children for schooling, including those with general language underdevelopment. The author considers types of general and special readiness for schooling. He pays attention to issues of continuity of different levels of education.

**Key words:** eadiness for learning at school; types of readiness; general underdevelopment of language; continuity of education for children with speech disorders; continuity.

**Уводзіны.** Падрыхтоўка да навучання ў школе, як паказвае практыка, для бацькоў некаторых дашкольнікаў можа з'явіцца не толькі радасцю, але і пэўнай праблемай. Ад яе станоўчага вырашэння не застаюцца ў баку настаўнікі-дэфектолагі і выхавацелі, таму што ад гэтага будзе ў далейшым залежыць паспяховасць такіх дзяцей пры навучанні ў школе. Гатоўнасць да школы — цэласная адукацыя, якая адлюстроўвае індывідуальны ўзровень развіцця дзіцяці перад пачаткам навучання ў школе [1] Яна залежыць ад узроўню сацыяльнага, фізіялагічнага, псіхічнага развіцця дзіцяці і адбываецца ў гульнявой ці вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

**Асноўная частка.** Падрыхтаванасцю да школьнага навучання ў выглядзе набытых якасцей, якія фарміруюць уменне вучыцца, лічылі А. В. Запарожац, В. С. Мухіна, А. М. Лявонцьеў і інш. Гэтымі навукоўцамі ў паняцце гатоўнасці да навучання ўключалася разуменне сутнасці навучальных задач. Дзіця павінна бачыць, у чым заключаецца адрозненне навучальных задач ад практычных, усведамляць спосабы выканання дзеянняў, валодаць навыкамі самакантролю і самаацэнкі. У дзіцяці павінны быць развіты валявыя якасці, яно павінна ўмець слухаць, назіраць, запамінаць, дамагацца рашэння пастаўленых задач [2]. На меркаванне некаторых даследчыкаў (Л. А. Венгера, Я. Я. Краўцова і інш.), «гатоўнасць да школы» — складанае па структуры, шматкампанентнае паняцце, ў якім вылучаюцца тры аспекты школьнай сталасці: асобасны, сацыяльна-псіхалагічны і інтэлектуальны.

У нашы дні гатоўнасць да навучання ў школе разглядаецца як падрыхтаванасць дзіцяці да школьнага навучання або вучэбнай дзейнасці. Падрыхтоўка і пачатак вучобы ў школе, як вядома, змяняюць ранейшае жыццё ў кожнага дзіцяці. Таму, як паказвае практыка, сярод першакласнікаў і сустракаюцца дзеці, якім бывае не па сваёй сіле поўнасцю спраўляцца (ці не могуць зусім) з усім аб'ёмам работы і вучэбнай праграмай. Гатоўнасць да пачатку школьнага навучання павінна вызначацца па такіх параметрах, як кантроль, планаванне, матывацыя і інтэлект [3]. Калі ж у дзіцяці не атрымліваецца планаваць і кантраляваць свае дзеянні, калі ў яго назіраецца нізкая матывацыя да навучання, калі яно не ўмее слухаць іншага чалавека і выконваць простыя аперацыі, то лічыцца, што час для школьнага навучання ў яго яшчэ не наступіў. У наш час разглядаецца фізічная (П. П. Блонскі, Л. А. Венгер, Л. С. Выгоцкі, П. Ф. Лесгафт і інш.) і псіхалагічная (Л. І. Бажовіч, А. Н. Лявонцьеў і інш.) гатоўнасць дзяцей да школьнага навучання.

Да псіхалагічнай гатоўнасці адносяцца: сацыяльна-асобасная і матывацыйная гатоўнасць; інтэлектуальная гатоўнасць; маўленчая гатоўнасць; эмацыйна-валявая гатоўнасць [4].

Да будучага навучання ў школе вылучаецца агульная і спецыялізаваная псіхалагічная гатоўнасць.У першым выпадку пад увагу бяруцца паказчыкі інтэлекту і сэнсаматорнага развіцця. Іх узровень вызначаецца пасля параўнання іх з дадзенымі,якія характэрны для «звычайных дашкольнікаў» дадзенага ўзросту. Калі атрыманыя вынікі стануць аднолькавымі, то дзіця можна адпраўляць у школу. У апошнія гады назіраецца варыятыўнасць стандартаў. Усё часцей прапаноўваецца праводзіцца супастаўленне індывідуальных паказчыкаў з паказчыкамі пэўнай групы. У якасці варыянту паказчыкаў «спецыяльнай гатоўнасці» ўжываюцца некаторыя практыкаванні праграм для «звычайных дашкольнікаў» дадзенага ўзросту (напрыклад, якасць і хуткасць чытання, лічэнне да 10 і г. д.). Усім вядома, што важна, каб вынікам працы і з дзецьмі стала засваенне асноўнай праграмы дашкольнай адукацыі. Аднак, як паказвае практыка, сустракаюцца выпадкі, калі гэта не атрымліваецца з-за пэўных абставін, якія пацверджаны псіхолага-медыка-педагагічнай камісіяй. У гэтым выпадку ўпор робіцца на сацыялізацыю дзіцяці і фарміраванне ў яго арыентаваных навыкаў. Для таго, каб зразумець, на якой стадыі сацыялізацыі дзіця ў дадзены час знаходзіцца мэтазгодна правесці яго комплексную дыягностыку. Аднак калі медыцынскае абследаванне не адбылося то важна, каб гэта не стала падставай для адмовы ад выкарыстання комплексу карэкцыйна-педагагічных мерапрыемстваў. Мэтазгодна, каб дыягностыка пачыналася з устанаўлення ўзроўня ўзаемадзеяння дзіцяці з іншымі людзьмі. Пры гэтым важна высветліць, хто з родных і блізкіх найбольш зацікаўлены ў развіцці дзіцяці, хто аказвае яму самую лепшую дапамогу, хто больш за ўсё кампетэнтны ў пытаннях стымулюючага ўплыву на яго. Варта таксама выявіць становішча дзіцяці ў сям'і, рэжым яго дня.

Адным з фактараў, якія станоўча спрыяюць паспяховасці адукацыі, з'яўляецца бесперапыннасць і пераемнасць у навучанні. Пры гэтым пад бесперапыннасцю маецца на ўвазе наяўнасць паслядоўных

Репозиторий БарГУ

навучальных задач на працягу ўсёй вучобы ў школе, якія спрыяюць інтэлектуальнаму развіццю дзяцей у кожным класе. У сваю чаргу пад пераемнасцю навучання разумеецца бесперапыннасць на межах розных этапаў адукацыі (дзіцячы сад, пачатковая школа і т. д.). У канчатковым рахунку — адзіная арганізацыя гэтых этапаў у рамках цэласнай сістэмы адукацыі. Такім чынам, бесперапыннасць і пераемнасць мяркуюць стварэнне і прыняццё адзінай сістэмы мэт і зместу адукацыі на ўсім працягу навучання ад дзіцячага саду да прафесійнага навучання. Пры дапамозе дарослых дашкольнік уваходзіць у свет дарослых людзей. Дашкольная адукацыя і забяспячэнне аднолькавых пачатковых магчымасцей дзецям для навучання ў школе разглядаецца як патрэбная перадумова даступнасці ў далейшым якаснай агульнай адукацыі ў нашай краіне. Варта адзначыць, што агульнае недаразвіццё мовы аказвае адмоўны ўплыў на гатоўнасць дзяцей да навучання ў школе.

У такіх дзяцей сустракаюцца прыкметы недастатковай устойлівасці ўвагі, абмежаванні яе аб'ёму і дыяпазону размеркавання. У іх адзначаюцца асаблівасці псіхаматорнага развіцця, якое вельмі часта не адпавядае іх узроставым нормам развіцця. Падкрэслім, што моўная гатоўнасць дзяцей да навучання ў школе вызначаецца тым, што яны ўмеюць выкарыстоўваць сваю мову ў якасці сродка адвольнага кіравання сваімі паводзінамі і ўласнымі пазнавальнымі працэсамі. Таксама вялікае значэнне мае маўленчае развіццё як галоўная ўмова для зносін дзіцяці і для стварэння перадумоў да фарміравання пісьмовай мовы, якая шмат у чым абумоўлівае ў далейшыя ўзроставыя перыяды яго інтэлектуальнае развіццё. Варта адзначыць, што слабая маўленчая дзейнасць дзяцей,як паказвае практыка, прыводзіць да парушэння развіцця такіх сфер іх псіхічнага жыцця, як сэнсарная, інтэлектуальная і валявая. Так, для дашкольнікаў з агульным недаразвіццём мовы характэрны наступныя асаблівасці псіхічнай дзейнасці: высокая нярвова-псіхічная спусташальнасць; эмацыйная няўстойлівасць.

Важна адзначыць і тое, што непаўнавартасная маўленчая дзейнасць дзяцей прыводзіць да парушэння развіцця такіх сфер іх псіхічнага жыцця, як сэнсарная, інтэлектуальная і валявая. Так, для такіх дашкольнікаў характэрны наступныя асаблівасці псіхічнай дзейнасці: высокая нярвова-псіхічная спусташальнасць; няўстойлівасць увагі, няўстойлівая працаздольнасць; эмацыйная няўстойлівасць; парушэнні псіхаматорнай каардынацыі; нізкі ўзровень запамінання; прысутнасць у мове памылак лагічнага і лексічнага характару.

Практыка паказвае, што ў працы з дзецьмі, якія маюць агульнае недаразвіццё мовы, настаўніку-дэфектолагу мэтазгодна праводзіць комплексную дыягностыку і нямоўных псіхічных функцый і працэсаў. Адзначым, што важна для таго, каб гэтыя паказчыкі педагогам у далейшым ўлічваліся перад планаваннем і арганізацыяй карэкцыйна працы сваімі выхаванцамі.

Адным з галоўных кампанентаў гатоўнасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту да навучання ў школе з'яўляецца сацыяльна-асобасная гатоўнасць, якая прадстаўляе сабой неабходны і дастатковы ўзровень сацыяльнага і псіхічнага развіцця дзіцяці для засваення імі ў далейшым школьнай вучэбнай праграмы ў калектыве аднагодкаў.

Адзначым яшчэ і тое, што развіццю якасцей, якія спатрэбяцца старэйшаму дашкольніку, як будучаму школьніку, як паказвае практыка, станоўча спрыяе сістэма карэкцыйнай дапамогі, якая грунтуецца на адэкватнай арыентацыі дзіцячай дзейнасці і ўсяго педагагічнага працэсу, што робіць асабліва важным уключэнне педагогаў дзіцячага сада і бацькоў у падрыхтоўку да школы дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі маўлення.

**Заключэнне.** Як сведчаць нашы назіранні, узровень развіцця маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з агульным недаразвіццём мовы будзе значна павышаны, калі настаўнік-дэфектолаг разам з выхавацелям сістэматычна і мэтанакіравана ў сваёй працы будуць выкарыстоўваць не толькі цікавыя, на думку сваіх выхаванцаў, дыдактычныя гульні, але таксама фарміраваць маўленне дзяцей адначасова з развіццём іх псіхічных працэсаў і разумовых здольнасцей, з выхаваннем пачуццяў, адносін і іх паводзін з акружаючым светам; усе задачы па развіцці маўлення рашаць у адзінстве і ў пэўнай паслядоўнасці; быць зацікаўленым у працэсе развіцця маўлення дашкольнікаў з парушэннямі маўлення.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Кирсанова, Е. Ю.* Формирование графо-моторных навыков у детей дошкольного возраста с речевыми нарушениями / Е. Ю. Кирсанова, В. В. Мануйлова // Современные аспекты комплексного сопровождения лиц с ограниченными возможностями здоровья и инвалидностью : сб. науч. ст. по материалам межрегион. науч.-практ. конф. с междунар. участием. — М. : МГПУ, 2019. — С. 143—148.
2. *Мануйлова, В. В.* Предшкольная подготовка детей с нарушениями в развитии как одно из условий обеспечения преемственности дошкольного и начального общего образования / В. В. Мануйлова // Актуальные проблемы современного раннего и дошкольного образования детей с инвалидностью и ОВЗ : сб. науч. ст. по материалам регион. науч.-практ. конф. — М., 2018. — С. 194—199.
3. *Мануйлова, В. В.* Коммуникативная компетентность дошкольника с ограниченными возможностями здоровья как одна из составляющих готовности к школьному обучению / В. В. Мануйлова // Коммуникативный подход в системе специального и инклюзивного образования детей с ограниченными возможностями здоровья : сб. науч. ст. по материалам межрегион. науч.-практ. конф. — М. : МГПУ, 2019. — С. 165—172.
4. *Любимов, М. Л.* Формирование функциональной грамотности у детей с ограниченными возможностями здоровья на основе развития проектной деятельности / М. Л. Любимов, О. Г. Приходько, М. О. Захарова, А. А. Мокс // Специальное образование. — 2020. — № 2 (58). — С. 73—93.


Рэпазіторый БарДУ